Шундрык Г.М.

# *РОЗДУМЫ І ПРАКТЫКАВАННІ…*

***Наш верціцца шарык па***
***вечных законах.***
***Эпоха - да дзёрзкіх узлётаў так ласа.***
***Няма тут, мой дружа,***
***шэдэўраў натхнёных -***
***Практыкаванні чацвёртага класа.***



*Аб сабе*

Нарадзіўся ў в.Задвор'е Слонімскага раёна ў 1936 годзе (мабыць, у 35-м), за Шчарай. Праз пару гадоў, яшчэ за польскім часам, бацькі пераехалі ў в.Сцяткоўшчыну – цяпер Дзятлаўскага раёна.

Змены ўлады, войны, акупацыя – усё гэта адклала свой адмоўны адбітак на жыццё і лёс людзей. У 1941 годзе загінуў бацька; за час вайны было расстраляна і загінула многа родзічаў.

Скончыўшы пачатковую і сямігадовую школы, паступіў у Навагрудскае педагагічнае вучылішча і з 1954 года 4 гады працаваў у школах Казлоўшчынскага раёна.

З дзяцінства любіў прыроду, музыку. Цікавіла жыццё і праца людзей, гісторыя.

Пасля арміі 10 гадоў працаваў выхавацелем у школе-інтэрнаце Дзятлава, арганізаваў духавы аркестр, вёў гурткі. Скончыўшы геаграфічны факультэт БДУ, выкладаў геаграфію ў беларускай школе (СШ №2), якая, як кажуць, была адзінай у раённых цэнтрах Беларусі.

Вопыт папярэдніх гадоў, хібы, недарэчнасці і супярэчнасці жыцця хвалявалі, застаўлялі задумвацца, рэагаваць. Так і з'явіліся мае нешматлікія вершы. А цяпер і пераклады.

**Маці-Радзіма**

О, Радзіма! Ты—маці ў журбе і красе,
Збераглі цябе нам Бог і час.
Беларусь, Беларусь, твае дзеці мы ўсе,
Ты—святая, адзіная ў нас!

Аддаём, дарагая матуля, табе
Розум, мары і сэрцаў агонь.
Гонар, славу шукаем у мірнай сяўбе:
Наша дружыць з сявенькай далонь.

Радасць - плён нам даюць сіла духу, моц рук,--
І такія спрадвеку мы ёсць.
Табе, родная, наша любоў без прынук;
Хлеб-соль шчыры для вас, брат і госць.

Дык красуй, зіхаці светлай зоркай заўжды
У сузор’і свабодных краін.
Знай: з табой, Беларусь, наш імпэт малады,
Мы з табою ўсе як адзін!

**Калісьці ўсе**

Каліcь  мы  ўсе з  маленства выйшлі,
І па жыцці – хто раб, хто госць.
Што я рабіў бы, каб Усявышні
Вярнуў мяне ў маладосць?
Найперш агледзеўся б наўкола:
Як рунь узнімецца у палях,
Бы той шкаляр заўзяты ў школу,
Адправіся б у доўгі шлях.
Дзядзькоў наведаць - бліжніх, дальніх:
Пачуць аповяд пра вайну,
Успаміны, казкі і паданні
І проста ўважыць сівізну.
Нам шмат патрэбна ў сталым веку:
Умець і ведаць, мець і дбаць,
Каб, як належыць чалавеку,
Было што ўнукам перадаць.
Затым, як след набіўшы ногі,
Дзесь на пагорку за сялом
Пабудаваў бы ля дарогі
Найпрыгажэйшы ў свеце дом.
І у доме тым за цуда-брамай
Пакой ў аздобе дываноў,
Высокі, сонечны, - для Мамы!-
За смутак, слёзы і любоў.
А па нядзелях і на святы
(Гары ў сталоўцы, вінны план!)
У сябра браў бы зухавата
Віндсёрфінг. Мабыць, й дэльтаплан.
І са стыхіяю ў згодзе
Дзяўчат дзівіў  бы, маладзіц,
Каб у каханай пры народзе
Ў  душы палаў агонь зарніц...
Калісьці ўсе з маленства выйшлі,
І на зямлі – хто раб, хто госць.
Ніхто пад Сонцам з нас не лішні.
У жыцці заўсёды шанцы есць.

## З хаўтураў

Матулі ад гора не хочацца жыць:
Сыночак любімы ў магіле ляжыць.
Любімы, адзіны, бы лісцік засох.
А колькі ж ён ведаў, а колькі б ён змог.
Упаў,--не ў агні, не ў глыбокай рацэ
З неслухам-дзіцем у смелай руцэ.
Не пры ахове чужых далячынь
(Ах, не шукайце спагадных прычын)—
Пайшоў у праклятага Бахуса раць,
Не думаў, не сніў жа тады паміраць.

Не, не пакінуць у бядзе на Русі.
…З неба сняжок меланхольна трусіў
На сосны прыціхлыя, дол, на вянкі.
Раз-пораз пускалі слязу сваякі:
У вушы ўляталі словы свінцом,
Якім ён, нябожчык, быў малайцом.
Жалобныя гукі аркестра плылі.—
Дзякуй вам, людзі, адпець памаглі.

У краіне маёй, ад мяжы да мяжы,
О колькі іх у жоўтым пясочку ляжыць:
Старых, маладых, дзябёлых, благіх,
А сэрцу іх родных такіх дарагіх.
Ляглі без патрэбы. З чыё жа віны?
Быццам нам мала было той вайны.
Не далюбілі, не дашумелі,
Песень жыцця не змаглі даспяваць.
І ў сваіх вечных халодных пасцелях
                                        Ціха ляжаць.
Часам нас клічуць нячутна адтуль…
Шкада мне заўчасна ссівелых матуль.